# ПРАСТОРАВА-ЧАСАВАЯ ЛАКАЛІЗАЦЫЯ «ТУТЭЙШАЙ» САМАІДЭНТЫФІКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

*Т.М.Мармыш*,
аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
культуры і мастацтваў

Па сваім тэрытарыяльным складзе культура Беларусі дастаткова неаднародная – складаецца з лакальных культур, адметных уласнымі асаблівасцямі моўнага, веравызнаўчага, побытавага характару, варыяцыямі мастацка-эстэтычных поглядаў носьбітаў гэтых культур і часта адпаведнымі лакальна-тэрытарыяльнымі самаідэнтыфікацыямі, традыцыйныя формы якіх маладаследаваныя айчыннай навукай. Адну з такіх форм рэпрэзентуе «тутэйшасць» – феномен беларускай культуры, заснаваны на ідэнтыфікацыі асобы з месцам пражывання, культурным ландшафтам, што з'яўляюцца кантэкстам жыцця і ўключаюць у сябе чалавека.

Вытворны ад тэрміна «тутэйшы», які азначае «мясцовы», паняцце «тутэйшасць» мае адценне прыналежнасці. У такой сувязі неабходна спыніцца на наступнай акалічнасці: спосаб абазначэння існасці асобы праз лакалізацыю свайго быцця, указанне на «прыналежнасць-да» атрыбутыўнае для індаеўрапейскай моўнай сям'і наогул. Важны ў гэтым дачыненні займеннік 1-й асобы адзіночнага ліку «я» (інд.-еўр. *He-g'H-(om)) трактуецца літаральна «вось-тутэйшасць» [5, с. 163].

Перадумовы замацавання «тутэйшасці» склаліся пад уплывам многіх фактараў і залежалі перш за ўсё ад гістарычных умоў развіцця беларускага этнасу, палітыка-сацыяльных зрухаў, пачынаючы з другой паловы XVI ст. – Люблінскай уніі і яе наступствамі для сацыяльнай эліты і сялянства, руска-польскай вайны, падзелаў Рэчы Паспалітай, а затым і русіфікатарскай палітыкі на тэрыторыі Беларусі. Уздзеянне польскай і рускай культур, «эміграцыя» ў іх «ліцвінскай» інтэлектуальнай эліты прывялі да набыцця пачуцця этнічнай няпэўнасці беларускага сялянства і вырашэння праблемы нацыянальнай прыналежнасці праз самаідэнтыфікацыю, угрунтаваную ў топас заселенага Месца, успрымаемага цэнтрам Сусвету.

«Тутэйшасць» стала адлюстроўваць сацыяльна-саслоўнае самавызначэнне. Адсюль сярод прычын інтэрыярызацыі жыцця і тым самым стварэння спрыяльнай глебы для тэрытарыяльнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атаясамлівання і ўкараненне ў локус пражывання можна абазначыць працэсы інкарпарацыі значнай часткі інтэлігенцыі ў іншыя культурныя кантэксты і дыскурсы, сацыяльную нестабільнасць (у выніку шматлікіх войн на тэрыторыі Беларусі, запрыгоньвання і інш.). Адносна працяглыя ў часавым вымярэнні, гэтыя працэсы сталі прычынай пераўтварэння якасцей «тутэйшасці» ў спецыфічную ментальную рысу аўтахтонных беларусаў, а таксама фарміравання і замацавання адпаведных архетыпічных вобразаў, што надалей прадвызначалі рэакцыі на рознага кшталту знешнія ўздзеянні.

«Тутэйшасць» як форма самаідэнтыфікацыі насельніцтва тэрыторыі Беларусі занатаваная ў тэкстах этнаграфічных даследаванняў канца XIX – пачатку XX ст.: «А если вы къ такимъ белорусамъ обратитесь съ вопросомъ – кто они такіе въ смысле національности, то очень многіе вам только и могутъ сказать, что они “тутэйшіе”, т. е. здешніе...» [1, с. 5]. Паказальным у дадзеным выпадку становіцца таксама назіранне, зробленае ў пачатку XX ст. Я. Карскім: «На вопросъ: кто ты? Простолюдинъ отвечаетъ – русскій, а если онъ католикъ, то называетъ себя либо католикомъ, либо полякомъ; иногда свою родину назоветъ Литвой, а то и просто скажетъ, что онъ “тутэйшій” (tutejszy) – здешній, конечно, противополагая себя лицу, говорящему по-великорусски, какъ пришлому въ западномъ крае» [2, с. 29]. Этнограф П. Шэйн адносна самавызначэння сялян Гродзенскай губерні мяжы XIX і XX стст. пазначаў: «Вообще о себе и своей стране они выражаются такъ: “Мы тутейшые, наша страна ни руска ни польска, але забраны край”» [6, с. 97, 98].

На аснове вывучэння фальклорна-этнаграфічных запісаў і гістарычных крыніц можна канкрэтызаваць «тутэйшасць» у прасторава-тэрытарыяльных арэалах і часавых вымярэннях. Найбольш выразна «тутэйшасць» праяўлялася ў абшарах тэрытарыяльна-геаграфічнага памежжа – на стыку трох этнічных культур – беларускай, польскай і ўкраінскай, лакалізаваных у межах гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняга Палесся, а таксама тэрыторыі Гродзеншчыны, уваходзячых у склад Заходняй Беларусі ў 20-я гг. XX ст., і ў выніку заключэння Рыжскай мірнай дамовы (1921 г.) разам з Заходняй Украінай (Валынская губерня), якія адышлі да Польшчы.

У 1921 г. на тэрыторыі Польскай дзяржавы быў праведзены перапіс насельніцтва. Паводле зафіксаваных даных у Палескім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваяводстве пражывалі 38,6 тыс. «тутэйшых» па нацыянальнай прыналежнасці асоб [4]. Пазней, у час перапісу 1931 г., 700 тыс. жыхароў Заходняга Палесся (сярод іх – этнічныя беларусы і ўкраінцы) абазначылі сваю родную мову як «тутэйшую», або «мясцовую» [7, s. 98].

На Гродзеншчыне ў складзе II Рэчы Паспалітай у міжваенны перыяд прасочваўся ўплыў трох ідэйных плыняў: польскай, беларускай і савецкай. Беларусы адчулі на сабе ўздзеянне асіміляцыйнай палітыкі новай улады. Адмаўленне ад прыняцця польскай культуры ў выглядзе дзяржаўных структур і ўлады было заснавана на ўсведамленні іх «чужымі» для мясцовай супольнасці і звязана са стратай экзістэнцыйнай бяспекі. Гэта паспрыяла ўключэнню часткі вясковай моладзі ў палітычнае жыццё. Светапоглядны крызіс закрануў і сталых людзей: ва ўмовах знікнення царскай улады і ганенняў на праваслаўную царкву яны страцілі звыклы лад жыцця і сацыяльную арыентацыю, але ўсё яшчэ заставаліся носьбітамі традыцыйнага сялянскага менталітэту і знаходзіліся пад уплывам адаптацыйнай стратэгіі існавання. Напластаванне некалькіх культур, моў і рэлігій уплывалі на самасвядомасць этнічнага селяніна-беларуса і выклікалі разгубленасць і яшчэ большае заглыбленне ў сваю архаічную філасофію жыцця, асабліва пасля разгрому беларускага руху польскім урадам у канцы 1920-х гг.: расчараваўшыся, сяляне вяртаюцца да сваёй інтравертнасці – пагружаюцца ў замкнутую сістэму лакальнага грамадства і перастаюць праяўляць сябе актыўнымі суб’ектамі сацыяпалітычнага жыцця. Такую сітуацыю вясковага асяроддзя Гродзеншчыны ў 30-х гг. XX ст. гісторык С. Токць называе «вяртанне да тутэйшасці».

Паўставанне нацыянальнага праекта і распаўсюджванне яго ў шырокіх колах народных мас, а таксама трансфармацыя традыцыйнага аграрнага грамадства ў XX ст. абумовілі нівеліраванне знешніх праяў «тутэйшага» самаўсведамлення і пераход яго ў латэнтны стан. Аднак для старэйшых генерацый жыхароў Заходняга Палесся і ў пачатку XXI ст. разам з захаваннем унікальных архаічных асаблівасцей мясцовай культуры, закумуляваных у гаворцы, нематэрыяльнай культурнай спадчыне, мадэлях паводзін, рэальнай застаецца няпэўнасць нацыянальнай самаідэнтыфікацыі: «*Вы як самі сябе называеце? Беларусы, ці тутэйшыя, ці літвіны...*». – «Як мы былі в Расее, то нас называлі «Гродзенска губернія». – «*Можа, палешукі?*» – «Не, не. А пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Польшчы – крэсы. Ну не знаю, якія там крэсы». – «*Ну, вы палешукі ці не?*» – «Не». – «*А хто? Беларусы?*» – «І не беларусы. Самозванцы. Я ж табе кажу»[1].

Тэрыторыя Беларусі, размешчаная на скрыжаванні Захаду і Усходу, з'яўляючыся кропкай судотыку праваслаўна-візантыйскай і каталіцка-раманскай традыцыі, у пэўным сэнсе і ёсць памежжа, рэчаіснасць чаго адсылае да транскультурнай камунікацыі некалькіх сацыякультурных сістэм у пэўным прасторавым локусе і ўтварэнні на гэтай аснове быццёвага асяроддзя, што ўздзейнічае на ідэнтыфікацыйныя працэсы ўнутры супольнасцей такіх тэрыторый. Логіка разваг у такім дачыненні не адмаўляе магчымасці пераносу якасцей «тутэйшасці» ў максімальна абагуленым выглядзе феномена на тэрыторыю ўсёй краіны. Таму невыпадкова беларуская культура часта характарызуецца ў агульным памежнасцю стану [3], пры гэтым адбываецца зварот да «тутэйшасці» – закансерваванага архетыпічнага коду беларускай памежнай культуры. Кансерватызм коду, схаваны ў свядомасці беларуса-аўтахтона, выліўся ў неакрэсленасць нацыянальнага самавызначэння XIX – пачатаку XX ст. і фарміраванне адпаведных ментальных уласцівасцей, нагадваючых час ад часу аб сабе і сённяшнім беларусам.


1. *Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А. Е. Богданович. – Репринт. изд. – Мінск: Беларусь, 1995. – 186 с.

2. *Карскі, Я.* Белая Русь / Я. Карскі // Імя тваё Белая Русь / укл. Г. М. Сагановіч. – Мінск : Полымя, 1991. – 317 с.

3. *Михеева, И. Б.* Беларусь и Польша: культурный симбиоз как историческая судьба / И. Б. Михеева // Belintellectuals. Інтэлектуальная супольнасць Беларусі [Электронный ресурс]. – 2011. – Режим доступа: http://www.belintellectuals.eu/library/book/200/. – Дата доступа: 13.03.2011.

4. *Токць, С.* Беларуская вёска на мяжы эпох / С. Токць // Беларуская інтэрнэт-бібліятэка «Камунікат» [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступу: http://autary.iig.pl/tokc/ knihi vioska zmiest.htm. – Дата доступу: 19.03.2011.


[1] Зап. у 2001 г. ад Ганны Аляксееўны Дунак, 1913 г. н., нар. у в. Вялікая Ракавіца, адукацыі не мае, правасл., в. Кашылава Брэсцкага раена (архіў экспедыцыйных матэрыялаў А. М. Боганевай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Топоров, В. Н.* О некоторых предпосылках формирования категории посессивности / В. Н. Топоров // Славянское и балканское языкознание. – М.: Наука, 1986. – С. 142–167.
6. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. – СПб.: Типография Имераторской Академии наук, 1902. – Т. 3. – 535 с.
7. *Siemakowicz, M.* Spisy ludnoњci a zagadnienie narodowoњciowe z uwzglкdnieniem spraw szkolnictwa dla mniejszoњci biaioruskiej w II Rzeczypospolitej / M. Siemakowicz // Biaioruskie Zeszyty Historyczne. – 1998. – № 10. – S. 82–106.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ